## § 28. Род назоўнікаў. Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах

**182.** Прачытайце тэкст.

Катэгорыя роду — адна з самых цікавых з'яў у мове. Ці задумваліся вы над тым, чаму *стол* — мужчынскага роду, *парта* — жаночага, а *малако* — ніякага? Ніхто з сучаснікаў не ўсведамляе, чаму назвы дрэў *вяз, клён, ясень, дуб* — мужчынскага роду, а *ліпа, асіна, сасна, бяроза, вярба* — жаночага. Што пакладзена ў аснову размеркавання назоўнікаў па родавых групах?

У розных мовах свету — неаднолькавая колькасць родаў. У многіх сучасных мовах тры роды. Ёсць мовы, у якіх толькі мужчынскі і жаночы род, а ёсць мовы «бязродавыя». Чаму так? Існуе думка, што ў старажытнасці рэчы, якія належалі жанчыне, называліся словамі жаночага роду — *нітка, хата, зямля, печ, каза*, а рэчы мужчыны — *конь, зубр, воўк, акунь* — мужчынскага роду.

У сучаснай беларускай мове род адушаўлёных назоўнікаў адлюстроўвае адрозненні паводле полу: *хлопчык — дзяўчынка, студэнт — студэнтка, воўк — ваўчыца*. Род неадушаўлёных назоўнікаў не залежыць ад лексічнага значэння слова *(Паводле Л. Сямешка)*.

Чаму катэгорыю роду вучоныя называюць адной з самых цікавых з'яў у мове? Ці існуе адказ на пытанне пра ўзнікненне катэгорыі роду?

Якога роду бываюць назоўнікі? Вусна прывядзіце прыклады з тэксту. Далучыце да прыведзеных назоўнікаў прыметнікі і дзеясловы ў форме прошлага часу. Запішыце. Выдзеліце ў словах канчаткі.

Узор. *Расл[а] прыгож[ая] ліп[а]*.

**183.** Прачытайце тэкст, далучаючы прыметнікі да назоўнікаў. Спішыце. Вызначце род назоўнікаў.

Калі на зямлі з'явіўся першы мастак? Яго след вядзе ў *(сівы)* даўніну, бо *(выяўленчы)* мастацтва — адно з самых старажытных. *(Галоўны)* тэма першых выяў старажытных мастакоў — жывёлы. Першыя малюнкі чалавека — гэта яго першыя веды пра свет, які поўніўся *(бясконцы)* безліччу небяспечных з'яў. Ствараючы

выявы жывёл, чалавек нечакана для сябе самога ўсвядоміў сваю *(магутны)* сілу і перавагу над зверам *(Паводле А. Таланцавай)*.

Прывядзіце прыклады канкрэтных і абстрактных назоўнікаў. Знайдзіце ў тэксце асабовыя назоўнікі.

Да якога тыпу маўлення адносіцца тэкст? Сцісла перакажыце яго змест.

!

Назоўнікі **агульнага роду** абазначаюць асоб і жаночага, і мужчынскага полу: *непаседа Аня, непаседа Толя.*

Некаторыя назоўнікі, якія абазначаюць прафесіі, званні, пасады, маюць толькі форму мужчынскага роду, але могуць адносіцца і да асоб жаночага полу: *сакратар (урач, інжынер, прафесар) Сямёнаў, сакратар (урач, інжынер, прафесар) Сямёнава.* Прыметнікі ўжываюцца пры такіх назоўніках у мужчынскім родзе, а дзеясловы прошлага часу — у мужчынскім ці ў жаночым родзе ў залежнасці ад полу асобы: *Дзяжурны ўрач Васількоў прымаў хворых. Участковы ўрач Маскалькова выпісала рэцэпт.*

**184.** Прачытайце. Вызначце род назоўнікаў.

Задзіра, плакса, падліза, соня, непаседа, забіяка, чысцёха, ціхоня.

Запішыце два словазлучэнні «прыметнік + назоўнік», каб у адным выпадку назоўнік меў значэнне мужчынскага роду, а ў другім — жаночага. Праскланяйце гэтыя словазлучэнні.

Якія назоўнікі характарызуюць чалавека з адмоўнага боку? У якім стылі пераважна ўжываюцца такія назоўнікі?

**185.** Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

### Живопись

**Живопись** — это **создание** художественных картин красками. Это очень древнее **искусство**. Там, где жили первобытные люди, можно найти **изображения** животных. На них люди охотились. Первые краски люди получали из **растений** и минералов *(Из книги «Календарь школьника»)*.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**Слоўнік**

создание — *стварэнне*
изображение — *выява*
охотиться — *паляваць*

Да выдзеленых слоў падбярыце і запішыце беларускамоўныя адпаведнікі. Зрабіце вывад пра тое, ці ўсе назоўнікі супадаюць у родзе ў беларускай і рускай мовах.

**186.** Утварыце словазлучэнні. Запішыце іх парамі на беларускай і рускай мовах. Вызначце род назоўнікаў і прыметнікаў.

*боль* → *моцны*, *сильная*

*медаль* → *залаты*, *золотая*

*гусь* → *белая*, *белый*

Зрабіце вывад аб несупадзенні роду назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

***меда́ль***

**187.** Прачытайце і адгадайце загадкі.

1. Нітак многа, а ў клубок не зматаеш. 2. Стаіць на гары, крыламі махае, супраць ветру грудзі падстаўляе. 3. Рагаты, ды не бык, ежу бярэ, людзям падае́. 4. Ні свет ні зара пайшоў сагнуты з двара. 5. Расце без цвету, а яе кветку на шчасце шукаюць. 6. Што на свеце ўсім трэба?

А д г а д к і: *назва, павуцінне, відэлец, млын, папараць, каромысел.*

Да слоў-адгадак падбярыце рускамоўныя адпаведнікі. Запішыце словы парамі. Вызначце род назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

## § 29. Лік назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах

**188.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак.

Цудаў у лесе было шмат! І ярка-чырвоныя ягады шыпшыны на белых кустах. І зялёныя венічкі чарнічніку. Чырвоным